# НАВУКОВЕЦ З РОДУ САПЕГАЎ

**А. В. Блінкоў**

*Гомельскі дзяржаўны тэхнічны універсітэт імя П. В. Сухога, Беларусь*

Навуковы кіраўнік П. П. Бухавец, магістар гіст. навук

Сапегі, буйны магнацкі род герба «Ліс» у ВКЛ, прадстаўнікі якога ў XV–XVIII ст.ст. займалі вышэйшыя дзяржаўныя, адміністрацыйныя і вайсковыя пасады. Лічыўся другім па значэнні (пасля Радзівілаў) магнацкім родам ВКЛ [1, с. 223]. Але гэты род вядомы не толькі сваёй магутнасцю і ўплывовасцю, але і заслугамі яго асобных прадстаўнікоў. Адным з такіх вядомых людзей у свой час быў Сапега Аляксандр Антоні.

Нарадзіўся ён 3 верасня 1773 г. у французскім горадзе Страсбургу. Першыя гады жыцця правёў пры двары ў Версалі пад наглядам няні, а затым у Страсбургу. З 1775 па 1785 – Аляксандр жыў у цёткі Ганны Ябланоўскай ў горадзе Сямяцічах, што зараз знаходзіцца ва ўсходняй Польшчы. У палацы цёткі знаходзіліся вялікія навуковыя калекцыі, што відавочна зацікавілі малога тады Аляксандра. У 1787 г. нядоўга навучаецца ў Віленскім універсітэце, бо бацька захварэў на воспу і ён быў вымушаны пакінуць Вільню [2, с. 30].

З ліпеня 1788 да сярэдзіны сакавіка 1789 г. знаходзіцца ў Варшаве і назірае за падзеямі на Чатырохгадовага сейму і піша лісты бацьку з каментарамі сеймавых падзей. У 1792 г. пазнаёміўся з географам і геолагам Станіславам Сташыцам, разам з якім пачалі займацца геалогіяй усходняй часткі Польшчы. У 1794 г. ён ажаніўся на Ганне Замойскай. Летам таго ж году маладая сям'я выехала ў Вену. Кантакты з пісьменнікам, літаратуразнаўцам Юзэфам Максімільянам Асалінскім і Оскарам Ліндэ паглыбляюць інтарэс Аляксандра да навукі. У наступныя гады знаходзіўся ў даследчай вандроўцы на Балканскім паўвостраве, у раёнах што былі населеных славянамі [3, с. 396]. У перыяд з 1797–1802 гг. займаўся мінералогіяй.

У 1800 г. Аляксандр разам са сваёй сям'ёй вяртаецца на радзіму. У тым жа годзе ў Варшаве было заснаванае «Таварыства сяброў навук» у склад якога ўваходзіць і Аляксандр Сапега. Ён удзельнічаў у некалькіх адкрытых пасяджэннях таварыства [2, с. 48]. У маі 1801 г. разам з сям'ёй знаходзіцца ў Парыжы, дзе наладжвае кантакты з Тадэвушам Касцюшкай і людзьмі з яго кола. У 1801–1802 гг. публікуе свае працы ў галіне хіміі. У 1802–1803 гг. адправіўся ў сваё вялікае падарожжа на Балканы. Вынікі дасьледаваньняў апублікаваў у 1811 г. у выглядзе лістоў да французскага натураліста Жана Эмануэля Жылібэра «Падарожжа ў славянскіх краінах у 1802 і 1803 гг.» [4]. Пасля кароткага перапынку знаходжання ў Францыі, дзе даў некалькі лекцый, вяртаецца на Балканы, там ён з перапынкамі прабыў да 1806 г. [2, с. 90].

У восень 1808 г., пасля некалькіх год палітычнай дзейнасці, сустракаецца з навукоўцамі Эрфрута і вяртаецца да заняткаў па хіміі. Амаль тады ж становіцца ганаровым сябрам Эрфруцкай акадэміі. З гэтага году і да самой смерці 8 верасня 1812 г. актыўна займаецца палітычнай дзейнасцю. З пачаткам вайны 1812 г. Аляксандр увайшоў у склад Часовага ўраду Вялікага княства Літоўскага і ўзначаліў ваенны аддзел, але ўжо 9 верасня памірае ў беларускім мястэчку Дзярэчын [5, с. 302]. Нягледзячы на свой нядоўгі век, Аляксандр паспеў стаць дастаткова вядомым падарожнікам, натуралістам, даследчыкам і палітыкам свайго часу, пакінуўшы пасля сябе спадчыну, якая яшчэ чакае свайго даследчыка.

Літаратура

1. Грыцкевіч, А. Сапегі / А. Грыцкевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск, 2001. – Т. 6, Кн. 1. – С. 223–228.
2. Skowronek, J. Z. magnackiego gniazda do napoleońskiego wywiadu. Aleksander Sapieha / J. Skowronek. – Warszawa : PWN, 1992. – 342 s.
3. Сапеги // Энциклопедический словарь Брокгауза и Ефрона : в 86 т. – Санкт-Петербург, 1900. – Т. 28А. – С. 394–396.
4. X***S*** Podróże w krajach słowiańskich odbywane w latach 1802 i 1803 przez / X***S***. – Wrocław, 1811. – 272 s.
5. Sapieha Aleksander // Dykcyonarz biograficzno-historzyczny: w 2 t. – Warszawa, 1844. – T. 2. – S. 302.